**Жарыкава А.А.,** *ст.выкладчык*

# АСПЕКТЫ ЭКАЛОГІІ Ў КУЛЬТУРАЛАГІЧНАЙ ПАДРЫХТОЎЦЫ СТУДЭНТАЎ

Сённяшні час своеасаблівы. Ён характарызуецца пошукам новых шляхоў цывілізаванага развіцця. Неабходнасць такога пошуку звязана з крызіснымі з'явамі, з якімі сутыкнулася цывілізацыя ў канцы XX стагоддзя і якія садзейнічалі ўзнікненню сучасных глабальных праблем. Сёння тэхнагенная цывілізацыя падышла да той рысы, за якой магчымы пераход яе ў новы якасны стан.

Пачынаючы с XVII ст. і да нашага часу ў еўрапейскай культуры панавала парадыгма, у адпаведнасці з якой чалавек павінен быў рэалізоўваць свае творчыя магчымасці, накіроўваючы актыўнасць на пераўтварэнне свету (і перш за ўсё прыроды). Такая ўстаноўка паступова стала дамінуючай каштоўнасцю тэхнагеннай культуры. Безумоўна, апошняя мела свае пэўныя дасягненні: зацвердзіліся ідэі прагрэсу, дэмакратыі, свабоды; расла вытворчасць, паляпшалася якасць жыцця людзей. Але разам з тым у канцы XX ст. чалавецтва сутыкнулася з глабальнымі праблемамі (у першую чаргу экалагічнай), якія сталі пагражаць існаванню самой цывілізацыі.

Які ж выхад з гэтай складанай сітуацыі? Што неабходна зрабіць, каб забяспечыць магчымасць выжывання чалавецтва?

У сучаснай сітуацыі фарміруецца новае бачанне прыроднага асяроддзя, з якім чалавек узаемадзейнічае. Вялікую ролю ў гэтым працэсе адыгрывае навука, якая садзейнічае ўзнікненню новых светапоглядных арыентацый і ідэалаў.

Сённяшні этап грамадскага развіцця, яго асаблівасці прад'яўляюць новыя патрабаванні да працэсу навучання і якасці адукацыі. Як вядома з Закона аб адукацыі Рэспублікі Беларусь,

мэтай яе з'яўляецца фарміраванне экалагічнай свядомасці, нацыянальнай самасвядомасці, развіццё навуковай, тэхнічнай і культурнай дзейнасці насельніцтва ў адпаведнасці з інтарэсамі развіцця суверэннай дзяржавы. Некаторыя патрабаванні да сучаснага адукацыйнага працэсу зафіксаваны ў арт.9 пад назвай «Адукацыя і экалогія». Прыярытэтным напрамкам сучаснага этапу адукацыі называецца экалагічная адукацыя. Гэта ў першую чаргу звязана з тым, што экалагічная сітуацыя ў рэспубліцы вельмі няпростая. Экалагічная адукацыя павінна даць маладому спецыялісту веды аб шляхах дасягнення гарманічных адносін чалавека і грамадства, іх далейшага развіцця. У гэтым плане экалагічная адукацыя з'яўляецца формай рэалізацыі гуманістычных ідэалаў, іх канкрэтнага ўвасаблення.

Важнасць экалагічных ведаў вызначаецца і сфармуляванымі ў Законе іншымі мэтамі адукацыі. Так, адной з іх прызнаецца «фарміраванне і ўмацаванне нацыянальнай самасвядомасці». А гэтага можна дабіцца пры ўмове засваення студэнтамі ведаў аб гісторыі і культуры Беларусі, яе развіцці ў мінулым і сучасным, аб складанай экалагічнай сітуацыі, аб прагназуемай будучыні беларускага народа. Такім чынам, узнікае патрэба прадметнага сінтэзу экалогіі і шэрага гуманітарных курсаў, якія выкладаюцца ў вышэйшых навучальных установах, уключэнне ў іх змест прыродазнаўчых ведаў. Актуальнасць такой інтэграцыі становіцца ўсё больш відавочнай.

Выхаванне будучага спецыяліста, станаўленне яго культуры неразрыўна звязана з фарміраваннем экалагічнай свядомасці. Вялікія магчымасці для вырашэння гэтай задачы закладзены ў шэрагу гуманітарных дысцыплін, у тым ліку ў курсе «Культуралогія». У прыватнасці, гэта такія тэмы, як «Культура і прырода», «Культура і цывілізацыя», «Старажытныя цывілізацыі», «Матэрыяльная і духоўная культура» і інш. Студэнты павінны ўсвядоміць, што родны край — не нешта абстрактнае, адчужанае, а сама натуральнасць чалавечага быцця.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пэўнае геаграфічнае становішча, мясцовасць, яе спецыфічныя прыродныя асаблівасці — адна з крыніц патрыятызму таго ці іншага народа. Яны накладваюць адбітак на нацыянальны характар, мову, культуру і г.д. Зберажэнне навакольнага асяроддзя, яго аднаўленне, экалагічнае выхаванне — гэта і выхаванне патрыятызму, культуры. Разбураючы прыроду роднага краю, мы тым самым разбураем і маральныя каштоўнасці чалавека.

Выкладаючы, напрыклад, тэму «Культура і прырода», варта акцэнтаваць ўвагу студэнтаў на тым, што светапоглядная праблема адносін чалавека да прыроды па-рознаму ставілася і вырашалася ў гісторыі чалавецтва. Існавала ў старажытнасці і зараз існуе мноства канцэпцый суадносін чалавека і прыроды. У прыватнасці, ужо ў антычнасці ўзнікаюць натуралістычныя канцэпцыі, якія імкнуліся наблізіць чалавека да прыроды (кінікі, геданісты і інш.).

У гісторыі развіцця навуковай думкі вядомы і такі яе накірунак, як рускі касмізм — вучэнне Вернадскага, Чыжэўскага, Цыялкоўскага. Гэта адзін з варыянтаў актыўна эвалюцыйнага асэнсавання задач чалавека ў свеце. Аснова яго — тэорыя наасферы (ператварэнне біясферы ў сферу розуму). Вядучую ролю ў ёй будуць адыгрываць разумныя, ідэальныя рэальнасці — творчыя адкрыцці, духоўныя, мастацкія, навуковыя ідэі і г.д. Наасфера яшчэ недзе наперадзе, на іншым, пакуль не дасягнутым узроўні планетарнай свядомасці.

Тым не менш на Зямлі створана новая штучная абалонка — біясфера, радыкальна пераўтвораная працай і творчасцю чалавека. Яшчэ рускія касмісты ў XIX ст. прадказвалі пагражальны накірунак ва ўзаемаадносінах чалавека і прыроды і сцвярджалі, што цывілізацыя, якая толькі эксплуатуе, а не аднаўляе прыроду, паскарае свой канец.

Разглядаючы гэта важнае пытанне, неабходна падкрэсліць, што грамадства ў сваёй рэальнай жыццядзейнасці



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўзаемадзейнічае не проста з прыродаю, а з прыроднымі працэсамі, абумоўленымі спецыфічнымі фактарамі. Таму сучасны ўзровень распрацоўкі філасофскіх праблем экалогіі, сацыяльна-біялагічнага развіцця чалавека робіць неабходным аналіз, перш за ўсё, заканамернасцей развіцця біялагічнай формы руху матэрыі. Калі не ўлічваецца філасофскае асэнсаванне пытанняў, звязаных з заканамернасцямі развіцця жывой прыроды, то гэта часам вядзе да абстрактных разважанняў аб аптымальным узаемадзеянні грамадства і прыроды. Хаця сучасныя сацыяльныя экалагісты арыентуюцца на постіндустрыяльнае будучае, а не даіндустрыяльнае мінулае і праяўляюць цікавасць да альтэрнатыўных тэхналогій, усё ж іх імкненні больш ляжаць у маральнай сферы, чым у экалагічнай і тэхналагічнай. У гэтым заключаецца іх блізкасць да класічнай утапічнай традыцыі, начынаючы з Т.Мора і заканчваючы У.Морысам.

Экалагічны утапізм як спосаб успрымання экалагічнай рэальнасці заключаецца ў мадэліраванні розных вобразаў, праектаў «аб аптымальным узаемадзеянні грамадства і прыроды» і інш., у якіх ілюзорна здымаюцца рэальныя супрацьлегласці антрапагенных уздзеянняў на фактары і рухаючыя сілы біялагічнай і сацыяльнай эвалюцыі чалавека.

Спецыяльнага разгляду патрабуюць пытанні экалагічнай культуры, звязаныя з захаваннем матэрыяльна-духоўных каштоўнасцей. Не толькі забруджванне знешняга асяроддзя, пагроза экалагічнага крызісу, але і забруджванне ўнутранага свету чалавека, яго духоўнай памяці і свядомасці набліжае распад асобы. Патрыятычныя пачуцці «ўсыхаюць» ад сурагатаў масавай культуры, ад бяздзейнасці душы і розуму чалавека, яго раўнадушша. Сапраўдныя гуманістычныя маральныя каштоўнасці ўзнікаюць і на традыцыях ранейшага культурнага асяроддзя, увасобленых у помніках матэрыяльнай і духоўнай культуры.

Феномен экалагічнай свядомасці быў уласцівы чалавеку з моманту яго ўзнікнення. Але праблема яе выхавання стала



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асабліва актуальнай у наш час. Некаторыя навукоўцы вызначаюць экалагічную свядомасць як глыбокае, даведзенае да аўтаматызму разуменне неразрыўнай сувязі чалавека з прыродай, залежнасці дабрабыту людзей ад цэласнасці і параўнальнай нязменнасці прыроднага асяроддзя жыцця чалавека.

У працэсе экалагізацыі грамадскай свядомасці можна выдзяляць наступныя стадыі: па-першае, праяўленне адносін чалавека да прыроды ў форме розных пачуццяў (раўнадушша, заклапочанасць, трывога і г.д.); па-другое, фарміраванне цікавасці да экалагічнай праблемы (выяўленне сутнасці эвалюцыйных змен у біясферы і інш.); па-трэцяе, пераход ад асэнсавання і разумення прыродных з'яў да сацыяльных дзеянняў, маральнага ўчынку; па-чацвёртае, адносіны чалавека да прыроды павінны стаць элементамі ўнутранай культуры асобы. У гэтым аспекце ўзровень экалагічнай свядомасці, узровень культуры — паказчык таго, наколькі глыбока і разнабакова грамадства ўключае прыроду ў сацыяльна значнае функцыянаванне на аснове пазнання і практычнага выкарыстання яе развіцця.

Экалагічны імператыў біясфернай этыкі патрабуе дзейнічаць так, каб заканамернасці развіцця біясферы складалі мэту, а не толькі сродак чалавечай дзейнасці.

Паступова грамадства прыходзіць да ўсведамлення таго, што чалавеку ва ўзаемадзеянні з прыродай дазволена далёка не ўсё. Разуменне гэтага факта становіцца часткай менталітэту грамадства. Узнікае ўяўленне аб існаванні нейкага экалагічнага імператыву, г.зн. сукупнасці ўмоў, якія чалавек не мае права пераступаць ні пры якіх акалічнасцях.

Такім чынам, экалагічная адукацыя — адна з важнейшых задач, якую неабходна вырашаць навучальным установам. Канцэпцыя экалагічнай асветы павінна разглядаць экалагічнае выхаванне як элемент агульнай адукацыі, звязаны з авалоданнем студэнтамі навуковымі асновамі ўзаемадзеяння прыроды і гра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

мадства. Мэтай экалагічнай адукацыі і выхавання з'яўляецца фарміраванне сістэмы навуковых ведаў, поглядаў і перакананняў асобы. Паказчыкі экалагічнай выхаванасці — практычныя дзеянні чалавека ў адносінах да прыроднага асяроддзя, свайго здароўя і здароўя будучых пакаленняў.

**Грынчык М.М.**, *прафесар*

# ВЫВУЧЭННЕ ГУМАНІСТЫЧНЫХ ВЫТОКАЎ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ЯК АСНОЎНЫ НАКІРУНАК КУЛЬТУРАЛАГІЧНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ

Пачынаючы з глыбокай старажытнасці, гуманізм (г.зн. любоў і павага да чалавека, а шырэй — духоўная еднасць, калектыўная салідарнасць людзей, аб'яднаных знешнімі ўмовамі чалавечага суіснавання) з'яўляўся зыходнай маральнай асновай далейшага развіцця і прагрэсу чалавецтва. Вядома, што асноўныя прынцыпы гуманізму як філасофскай канцэпцыі былі сфармуляваны ў часы антычнасці, але сваёй глыбокай дэмакратычнай сутнасцю былі скіраваны супраць афіцыйнай ідэалогіі, якая ў сваёй дзяржаўнай палітыцы больш схілялася да воўчых законаў прымусу і варожасці (нагадаем трагічны лёс славутага Сакрата).

У эпоху зараджэння хрысціянства і яго імклівага распаўсюджання ў Еўропе стыхійны першабытны гуманізм арганічна ўваходзіць у аснову хрысціянскай маралі, становіцца зыходнай асновай духоўнага выхавання чалавека, фарміравання яго грамадскіх поглядаў, творчай дзейнасці і культуры ў самым шырокім сэнсе гэтага паняцця. Паступова фарміруецца даволі трывалая і паслядоўная тэорыя класавай салідарнасці ў аснове



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ